УДК 821.112.2.09

А. А. Бураў
ст. выкладчык каф. нямецкай філалогіі і лінгвадыдактыкі
Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна
e-mail: andrey_26@mail.ru

ЛІНГВІСТЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ ЛЕКСІЧНЫХ ТРАНСФАРМАЦЫЙ У МАСТАЦКІМ ПЕРАКЛАДЗЕ

Разглядаюцца праблема эквівалентнасці мастацкага перакладу і звязаныя з ёй лексічныя трансфармацыі ў мастацкім перакладзе. На матэрыяле арыгінальных тэкстаў Ё. В. Гётэ і Г. Гесэ і іх беларускамоўных перакладаў аналізуюцца такія лексічныя прыёмы, як канкрэтызацыя, генералізацыя, кампенсацыя і антанімічны пераклад.

Уводзіны

Адным з самых прыкметных феноменаў нашага часу з'яўляецца патрэбнасць у зносінах паміж народамі і асобнымі людзьмі і шматразова пераўзыходзячая ўсё, што было ў мінулым, рэалізацыя гэтай патрэбы. Развіццё транспарту, сродкаў інфармацыі і камунікацыі, павышэнне культурнага і адукацыйнага ўзроўняў, усведамленне неабходнасці паразумення і супрацоўніцтва, пошукі шляхоў і сродкаў вырашэння глабальных праблем сучаснасці – усё гэта можа быць дасягнута толькі аб'яднанымі сіламі ўсіх народаў і ўсіх людзей. Несумненна, усе гэтыя фактары з'яўляюцца магутным стымулам для развіцця перакладчыцкай дзейнасці. З развіццём цывілізацыі роля перакладу ў жыцці чалавецтва няўхільна ўзрастае, ён як бы пранізвае ўсе сферы чалавечай дзейнасці.

Самым пашыраным і найбольш складаным з'яўляецца мастацкі пераклад, таму што стыль мастацкай літаратуры арганічна ўбірае ў сябе ўсе іншыя моўныя стылі: публіцыстычны, афіцыйна-дзелавы, навуковы і г. д. Апрача таго, у ім, у адрозненне ад іншых відаў перакладу, узнаўляецца спецыфічная слоўная вобразнасць, цэласны мастацкі твор наноў аднаўляецца ў чужой мове ў адзінстве зместу і формы. Мастацкі пераклад немагчымы без творчых здольнасцей перакладчыка, наяўнасці ў яго своеасаблівага мастакоўскага таленту. Вядомы перакладазнаўца П. М. Топер адзначае, што «зыходным пунктам для вызначэння месца і ролі перакладу ў міжмоўных літаратурных узаемаадносінах павінна быць думка пра стварэнне новых эстэтычных каштоўнасцей на роднай глебе» [1, с. 17].

Мастацкі пераклад – гэта від перакладчыцкай дзейнасці, асноўная задача якой заключаецца ў тым, каб аказаць мастацка-эстэтычнае ўздзеянне на чытача. Гэты пераклад, як і іншы, не з'яўляецца простай заменай слоў на моўным і тэматычным узроўнях згодна з граматычнымі правіламі, а ўяўляе сабой сродак мастацкага ўвасаблення, ён носьбіт эстэтычнай значнасці твора. Такім чынам, пераклад мастацкага твору – гэта не толькі дакладная перадача думак зместу, але і стварэнне сродкамі мовы ўсіх асаблівасцей стылю і формы паведамлення. Асноўная праблема заключаецца ў тым, што ў большасці выпадкаў мова арыгінала і мова перакладу з'яўляюцца рознымі па ўнутранай структуры.

Спецыфіка перакладу, якая адрозніваe яго ад усіх іншых відаў моўнага пасрэдніцтва, заключаецца ў тым, што ён служыць для паўнапраўнай замены арыгінала і што рэцэптары перакладу лічаць яго тоесным зыходнаму тэксту. Разам з тым відавочна, што абсалютная тоеснасць перакладу арыгінала не дасягаецца і што гэта зусім не перашкаджае ажыццяўленню міжмоўнай камунікацыі. Справа не толькі ў непазбежных стратах пры перадачы асаблівасцей паэтычнай формы, культурна-гістарычных асацыя-

цый, спецыфічных рэалій і іншых асаблівасцей мастацкага перакладу, але і ў несупадзенні асобных элементаў сэнсу ў перакладах самых элементарных выказванняў.

Мастацкі тэкст з'яўляецца складанай моўнай адзінкай, якая акумулюе ў сабе разнастайны змест. Моўныя сродкі ў якасці складнікаў зносін паміж мастаком слова і чытачом маюць асаблівае значэнне. Аўтара мастацкага тэксту належыць разглядаць як носьбіта ведаў, частка якіх «закладзена» ў гэты твор свядома, а іншая частка ўводзіцца несвядома.

Уплыў на чытача тэкставага паведамлення яшчэ недастаткова даследаваны. Не зусім ясна і тое, якім чынам і ў якой ступені адбываецца ўспрыманне рэцыпіентам тэксту нават у тых выпадках, калі і аўтар, і чытач належаць адной культуры, не кажучы ўжо пра выпадкі, калі абодва належаць розным культурам, а працэс камунікацыі ажыццяўляецца пры дапамозе медыума – перакладчыка.

Пытанне пра тое, што такое эквівалентнасць перакладу, які змест укладваецца ў паняцце перакладчыцкай эквівалентнасці, заўсёды з'яўлялася і зараз з'яўляецца галоўнай праблемай як тэорыі, так і практыкі перакладу. Ад таго, як уяўляе сабе эквівалентнасць перакладу перакладчык, залежаць вынікі яго практычнай работы, якасць перакладу.

Як адзначае вядомы чэшскі перакладазнаўца І. Левы, тэорыю перакладу лічаць або лінгвістычнай, або літаратуразнаўчай дысцыплінай. У кампетэнцыю мовазнаўства ўваходзіць параўнальнае вывучэнне дзвюх моўных сістэм. На гэты конт чытаем у аўтарытэтнай крыніцы: «Але, хоць пошук моўных эквівалентаў і складае ільвіную частку працы перакладчыка, імі гэтая праца не абмяжоўваецца... Элементы дзейнасці перакладчыка... крытычная ацэнка ўздзеяння перакладзенага твора на жыццёвую праблематыку асяроддзя перакладчыка, выбар інтэрпрэтацыйнай пазіцыі, перанос мастацкай рэчаіснасці арыгінала і яго стылістыкі ў новае культурнае асяроддзе і г. д. – гэтыя элементы адносяцца ўжо да сферы мастацтва; менавіта гэтымі суадносінамі дзвюх розных канкрэтызацый аднаго і таго жа твора, дваістай структурай перакладу і яго функцыяй у нацыянальнай культуры займаецца літаратуразнаўства» [2, с. 89].

У наш час камунікатыўная эквівалентнасць новага тэксту ў дачыненні да арыгінала, як сцвярджае А. Ф. Архіпаў, забяспечваецца выкананнем трох асноўных патрабаванняў:

1) тэкст перакладу павінен па магчымасці захаваць сэнсавы аб'ём арыгінала, таму недапушчальна адвольна прапускаць або дабаўляць інфармацыю, як і недапушчальна ўзмацняць менш істотную інфармацыю, бо тады больш значная страціць сваю вагу;

2) тэкст перакладу павінен адпавядаць нормам мовы перакладу, бо іх парушэнне па меншай меры стварае перашкоды для ўспрымання інфармацыі, а часам вядзе і да яе скажэння;

3) тэкст перакладу павінен быць супастаўляльны з арыгіналам па сваім аб'ёме, чым забяспечваецца падабенства стылістычнага эфекту з пункту погляду лаканічнасці ці разгорнутасці выкладу, а таксама дасягаецца суадноснасць затрат часу на атрыманне тэкставай інфармацыі [3, с. 6].

Выкананне названых патрабаванняў да перакладу часта звязана з пераадольваннем рознага роду аб'ектыўна існуючых цяжкасцей, абумоўленых адрозненнем сістэм зыходнай мовы і мовы перакладу, культурных фонаў носьбітаў дзвюх моў і іншых фактараў.

Абсалютна дакладная перадача інфармацыі пры перакладзе практычна выключаецца. Размова можа ісці толькі аб той ці іншай ступені падабенства інфармацыі, якую можна дасягнуць пры гэтых умовах. Ступень эквівалентнасці перакладу залежыць таксама і ад таго, наколькі ў ім аб'ектыўна захаваны нормы мовы перакладу. У гэтых адносінах крытэрыі ацэнкі перакладу на родную мову, натуральна, вышэйшыя, чым адпаведныя крытэрыі да перакладаў з роднай мовы на замежную.

Разам з тым не павінна складвацца ўражанне, быццам аптымальная ступень эквівалентнасці пісьмовага перакладу на родную мову прадугледжвае толькі адзін вары-

янт – адзіна магчымы і абсалютна бездакорны. Аптымальна эквівалентны пераклад азначае толькі тое, што ў ім выявілася правільнае разуменне арыгінала і для яго адлюстравання на мове перакладу знойдзены такія сродкі, якія разам з іншымі, сінанімічнымі, выключаюць сэнсавыя недакладнасці і скажэнні, а таксама нарматыўныя хібы: арфаграфічныя, пунктуацыйныя, лексіка-граматычныя і стылістычныя. Такім чынам, галоўнай мэтай перакладу з'яўляецца дасягненне эквівалентнасці.

Зыходзячы з гэтага, мы можам сцвярджаць, што эквівалентны пераклад – гэта такі пераклад, які здзяйсняецца на ўзроўні, неабходным і дастатковым для перадачы нязменнага плану зместу пры прытрымліванні адпаведнага плану выразу, які захоўвае нормы мовы-перакладчыцы. На думку А. У. Фёдарава, эквівалентнасць – гэта «вычарпальная перадача сэнсавага зместу арыгінала і поўная функцыянальна-стылістычная адпаведнасць яму» [4, с. 25].

Трансфармацыя – аснова большасці прыёмаў перакладу. Яна заключаецца ў змяненні фармальных (лексічныя або граматычныя трансфармацыі) або семантычных (семантычныя трансфармацыі) кампанентаў зыходнага тэксту пры захаванні інфармацыі, прызначанай для перадачы. Я. І. Рэцкер вызначае трансфармацыі як «прыёмы лагічнага мышлення, з дапамогай якіх мы раскрываем значэнне іншамоўнага слова ў кантэксце і знаходзім яму рускі адпаведнік, які не супадае са слоўнікавым» [5, с. 38].

Матывы і прычыны выкарыстання перакладчыцкіх трансфармацый кожны лінгвіст бачыць па-свойму. Так, Л. К. Латышаў прапануе тэрмін «камунікатыўная кампетэнцыя». Пад камунікатыўнай кампетэнцыяй разумеецца комплекс перадумоў, без якіх немагчыма моўная камунікацыя: «Рэакцыя чалавека на тэкст вызначаецца не толькі ўласцівасцямі самога тэксту (яго семантыкай і структурай), але і наяўнасцю вызначаных перадумоў, якімі чалавек павінен валодаць, каб адэкватна ўспрыняць і інтэрпрэтаваць тэкст, наяўнасць звычак да вызначаных моўных стандартаў і стэрэатыпаў і вызначаных папярэдніх ведаў, без якіх нельга зразумець, аб чым ідзе размова» [6, с. 29].

Найбольш распаўсюджанымі трансфармацыямі з'яўляюцца лексічныя, да ліку якіх адносяць такія прыёмы, як генералізацыя, канкрэтызацыя, антанімічны пераклад і кампенсацыя.

Пры лексічных трансфармацыях адбываецца замена асобных лексічных адзінак (слоў і ўстойлівых выразаў) адной мовы лексічнымі адзінкамі іншай мовы, якія не з'яўляюцца іх слоўнікавымі эквівалентамі, гэта значыць, узятыя ізалявана, яны маюць іншае рэферэнцыяльнае значэнне.

Канкрэтызацыяй называецца замена слова або словазлучэння зыходнай мовы з больш шырокім рэферэнцыяльным значэннем словам або словазлучэннем мовы-перакладчыцы з больш вузкім сэнсам.

У раздзелах «Фаўста» можна адзначыць таксама прыклады і гэтай замены:

Sie hören nicht die folgenden Gesänge, *Die Seelen, denen ich die ersten sang* [7, с. 7].	*Майго не ўчуюць голасу ніколі* *Сябры, якіх калісь мой лашчыў спеў* [8, с.13].

Так, у працытаваным фрагменце канкрэтызацыю бачым пры замене слова *die Seele (душа)* лексемай з больш вузкім значэннем *сябар*.

Прывядзём яшчэ адзін фрагмент:

Ihr Anblick gibt den Engeln Stärke, *Wenn keiner sie ergründen mag;* *Die unbegreiflich hohen Werke* *Sind herrlich wie am ersten Tag* [7, с. 15].	*Магутнасць творчага гарэння* *Нам прыбаўляе свежых сіл,* *І, нібы ў першы дзень тварэння,* *Уражвае палёт свяціл* [8, с. 21].

У гэтым выпадку канкрэтызацыя заўважаецца пры перакладзе наступных слоў: *den Engeln – нам* і *wie am ersten Tag – нібы ў першы дзень тварэння*.

Генералізацыяй называецца з'ява, адваротная канкрэтызацыі, – замена адзінкі першапачатковага тэксту, якая мае вузейшае значэнне, адзінкай мовы-перакладчыцы з больш шырокім значэннем. Прывядзём некалькі прыкладаў генералізацыі ў перакладзе рамана Г. Гесэ «Гульня шкляных перлаў»:

Je und je saß er mit ihm eine Stunde in einer der Übungskammern am Klavier und nahm Werke seiner Lieblingsmusiker mit ihm durch oder ein Musterbeispiel aus den alten Kompositionslehren [9, с. 65]. *– У кожны прыезд ён гадзінамі праседжваў з Ёзэфам за інструментам, разам з ім вывучаў творы сваіх любімых кампазітараў або разбіраў з старых падручнікаў кампазіцыі* [10, с. 60].

У гэтым сказе пры перакладзе відавое па-няцце заменена родавым. Але пераклад з'яўляецца эквівалентным, бо з кантэксту мы ведаем, пра які інструмент ідзе гаворка.

Dankbar und leuchtend blickte Knecht ihn an. Er strahlte, aber er brachte kein Wort heraus [9, с. 48]. *– Хлопчыкавы вочы свяціліся ўдзячнасцю, – ды і не толькі вочы, ён сам свяціўся, але не мог вымавіць ні слова [10, с. 45]*.

Нормы беларускай мовы дазваляюць перакласці сказ наступным чынам: *Ён сіяў…* Але каб дасягнуць большай вобразнасці, перакладчык замяняе дзеяслоў *strahlen* беларускім дзеясловам *свяціўся*. Пры гэтым адбываецца сінтаксічная перабудова сказа – просты сказ замяняецца складаным. Гэтыя замены абумоўлены стылістычнымі меркаваннямі.

Die Anekdote klingt glaubhaft, Knecht war ohne Zweifel stets ein guter Kommilitone und niemals liebedienerisch nach oben; daß aber jene Bestrafung wirklich in vier Jahren die einzige gewesen sei, ist doch recht wenig wahrscheinlich [9, с. 62]. *– Расказ гэты здаецца нам падобным на праўду: несумненна, Кнэхт заўсёды быў таварышаваты, ніколі не добрыўся перад вышэйшым, але што гэтае пакаранне было адзінае за ўсе чатыры гады, нешта не верыцца* [10, с. 57].

Нямецкі назоўнік *die Anekdote*, які мае вузейшае значэнне, заменены назоўнікам *расказ*, якое мае больш шырокае значэнне. Такая генералізацыя абумоўлена кантэкстам і называецца кантэкстуальнай.

Ein Mitschüler soll später versichert haben, Knecht sei in den vier Eschholzer Jahren nur ein einziges Mal (durch Entzug des Wochenausfluge) bestraft worden, und zwar, weil er sich hartnäckig geweigert habe, den Namen eines Kameraden anzugeben, der etwas Verbotenes getan hatte [9, с. 61]. *– Азін яго аднакласнік ужо многа пазней казаў, быццам за ўсе чатыры гады Кнэхта каралі ўсяго раз (яго пазбавілі права на суботні шпацыр) за тое, што ён упарта адмаўляўся назваць імя таварыша, які нешта там натварыў* [10, с. 57].

Нямецкі дзеяслоў *versichern (упэўніць, заверыць)* мае вузейшае значэнне, чым дзеяслоў *казаць*, на які ён заменены ў перакладзе. На аснове дадзеных шырокага кантэксту мы разумеем, што ішла спрэчка. Такім чынам, такі пераклад гэтага сказа з'яўляецца эквівалентным, і гэтая замена не паўплывала на сэнс сказа.

Антанімічны пераклад – гэта комплексная лексіка-граматычная замена, сутнасць якой заключаецца ў трансфармацыі сцвярджальнай канструкцыі ў адмоўную або наадварот:

Die meisten Eliteschüler, ja beinahe alle, empfinden zwar ihre Wahl als ein großes Glück, als eine Auszeichnung, auf die sie stolz sind… [9, с. 55]. *– Большасць вучняў эліты, нават амаль ці не ўсе, прымаюць сваё выбранне як вялікае шчасце, як нейкае выасабленне, якім яны ганарацца…* [10, с. 51].

Нямецкая сцвярджальная канструкцыя заменена беларускай адмоўнай пры дапамозе адмоўнай часціцы *не*. Пры гэтым сэнс арыгінала застаўся нязменным.

Entschuldige mich, ich bin kein sehr guter Wirt [9, с. 69]. – *Прабач, я дрэнны гаспадар* [10, с. 64].

Нямецкая адмоўная канструкцыя перадаецца беларускай сцвярджальнай, а прыметнік *guter* заменены яго беларускім антонімам *дрэнны*. Такая падвоеная замена надае той жа самы сэнс у цэлым.

Варта мець на ўвазе, што адмаўленне ў нямецкай мове выяўляецца не толькі пры дапамозе адмоўнай часціцы *nicht*, але і іншымі сродкамі:

Josef fühlte sich vom ersten Augenblick an wohl am Ort und ging vergnügt auf Oskars Ton ein; kaum war eine leise Verlegenheit an ihm zu spüren… [9, с. 62]. – *Ёзэф і праўда адчуў сябе добра ў Эшгольцы і ахвярна прыняў Оскараў тон; у яго паводзінах амаль не відно было нясмеласці…* [10, с. 56].

У дадзеным прыкладзе прыслоўе *kaum (ледзь)* заменена прыслоўем *амаль* з адмоўнай часціцай *не*. Гэтая трансфармацыя абумоўлена стылістычнымі прычынамі і не паўплывала на захаванне сэнсу арыгінала.

Die Anekdote klingt glaubhaft, Knecht war ohne Zweifel stets ein guter Kommilitone und niemals liebedienerisch nach oben; daß aber jene Bestrafung wirklich in vier Jahren die einzige gewesen sei, ist doch recht wenig wahrscheinlich [9, с. 62]. – *Расказ гэты здаецца нам падобным на праўду: несумненна, Кнэхт заўсёды быў таварышаваты, ніколі не добрыўся перад вышэйшым, але што гэтае пакаранне было адзінае за ўсе чатыры гады, нешта не верыцца* [10, с. 57].

Для дасягнення эквівалентнасці перакладчык замяняе сцвярджальную канструкцыю *ist doch recht wenig wahrscheinlich* адмоўнай *нешта не верыцца*. Гэта абумоўлена стылістычнымі меркаваннямі і разыходжаннямі ў ладзе двух моў: перавесці даслоўна гэтую канструкцыю проста немагчыма. А каб захаваць структуру зыходнага сказа, перакладчык выкарыстоўвае пры перакладзе менавіта дзеяслоў.

У наступным урыўку фразу *vor mir verschließt sich die Natur (перада мной закрываецца прырода)* В. Сёмуха перакладае ў «Фаўсце», ужываючы метад антанімічнага перакладу з адмоўнай часціцай *не*. Аднак пры гэтым ён парушае трывальна-часавыя катэгорыі дзеясловаў-выказнікаў *sich verschließen (закрывацца) – адкрыць* і таксама ажыццяўляе замену дзейніка: калі ў арыгінале дзейнік *die Natur (прырода)*, то ў перакладзе – *Дух*:

Der große Geist hat mich verschmäht,	*Абразіў Дух мяне, не выслухаў малітвы*
Vor mir verschließt sich die Natur [7, с. 58].	*І не адкрыў сакрэт прыродных з'яў [8, с. 67].*

Адным з прыёмаў дасягнення эквівалентнасці перакладу з'яўляецца ***кампенсацыя***. Гэты прыём ужываецца ў тых выпадках, калі вызначаныя элементы першапачатковага тэксту па той ці іншай прычыне не маюць эквівалентаў у мове-перакладчыцы і не могуць быць перададзены яе сродкамі; у гэтых выпадках, каб «кампенсаваць» семантычную страту, выкліканую тым, што тая або іншая адзінка першапачатковага тэксту засталася неперакладзенай або недастаткова перакладзенай (не ва ўсім аб'ёме свайго значэння), перакладчык перадае тую ж самую інфармацыю якім-небудзь іншым сродкам, прычым не абавязкова ў тым жа самым месцы тэксту, што і ў арыгінале.

Josef fühlte sich vom ersten Augenblick an wohl am Ort und ging vergnügt auf Oskars Ton ein; kaum war eine leise Verlegenheit an ihm zu spüren… [9, с. 61]. – *Ёзэф і праўда адчуў сябе добра ў Эшгольцы і ахвярна прыняў Оскараў тон; у яго паводзінах амаль не відно было нясмеласці…* [10, с. 56].

Нямецкі ўстойлівы выраз *wohl am Ort* таксама не мае непасрэднага адпаведніка ў беларускай мове. Каб перадаць сэнс сказа ва ўсім аб'ёме, перакладчык выкарыстоўвае прыслоўе *добра*.

Je und je saß er mit ihm eine Stunde in einer der Übungskammern am Klavier und nahm Werke seiner Lieblingsmusiker mit ihm durch oder ein Musterbeispiel aus den alten Kompositionslehren [9, с. 65]. – *У кожны прыезд ён гадзінамі праседжваў з Ёзэфам за інструментам, разам з ім вывучаў творы сваіх любімых кампазітараў або разбіраў з старых падручнікаў кампазіцыі* [10, с. 60].

Заменай стылістычна нейтральнага дзеяслова *saß* дзеясловам *праседжваў* перакладчык тлумачыць, што настаўнік праводзіў многа часу разам з Ёзэфам, у арыгінале гэта адлюстравана выразам *je und je*. Гэтым жа абумоўлена выкарыстанне множнага ліку назоўніка *гадзінамі* замест адзіночнага, як у арыгінале.

У перакладзе наступнага сказа назіраецца апушчэнне слова *wildes (дзікі),* якое перакладчык імкнецца кампенсаваць словам *каханне*, аднак выраз *дзікі агонь* мае больш шырокае значэнне, чым выраз *агонь кахання*.

Er facht in meiner Brust ein wildes Feuer	*Распальвае ў душы маёй агонь,*
Nach jenem schonen Bild geschäftig an [7, с.104].	*Агонь кахання абуджае*
	зноў [8, с. 121].

Кампенсацыя выкарыстоўваецца асабліва часта там, дзе неабходна перадаць унутрылінгвістычныя значэнні, якія характарызуюць тыя або іншыя моўныя асаблівасці арыгінала – дыялектную афарбоўку, індывідуальныя асаблівасці мовы, каламбуры, гульню слоў і інш., а таксама пры перадачы прагматычных значэнняў, калі не заўсёды можна знайсці прамы і непасрэдны адпаведнік той або іншай адзінцы першапачатковага тэксту ў сістэме мовы-перакладчыцы. Прыём кампенсацыі выразна ілюструе тое, што эквівалентнасць перакладу забяспечваецца на ўзроўні не асобных элементаў тэксту (у прыватнасці, слоў), а перакладаемага тэксту ў цэлым.

Такім чынам, пры супастаўленні арыгінальных і беларускамоўных мастацкіх тэкстаў можна адзначыць, што знакаміты беларускі перакладчык В. Сёмуха найбольш часта карыстаецца такімі прыёмамі, як антанімічны пераклад і кампенсацыя, што, у сваю чаргу, абумоўлена істотнымі адрозненнямі ў граматычным ладзе дзвюх моў і адсутнасцю ў беларускай мове пэўных рэалій нямецкай мовы.

Заключэнне

Такім чынам, супастаўляючы мастацкі арыгінал і пераклад, неабходна ўлічваць ролю кантэксту і ў сувязі з ім ролю розных спосабаў лексічных трансфармацый.

Для твораў мастацкай літаратуры дамінантнай з'яўляецца не столькі камунікатыўная, як мастацка-эстэтычная ці паэтычная функцыя. Тут важна не толькі перадаць змест, але і выразіць яго роўназначнымі арыгіналу мастацкімі сродкамі іншай мовы з мэтай, каб пераклад мог аказаць на чытача тое самае мастацка-эстэтычнае ўздзеянне, што і арыгінал.

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Топер, П. М. Перевод в системе сравнительного литературоведения / П. М. Топер. – М. : Наследие, 2000. – 254 с.

2. Левый, И. Искусство перевода / И. Левый. – М. : Прогресс, 1974. – 398 с.

3. Архипов, А. Ф. Самоучитель перевода с немецкого языка на русский / А. Ф. Архипов. – М. : Высш. шк., 1991. – 255 с.

4. Федоров, А. В. Основы общей теории перевода / А. В. Федоров. – М. : Высш. шк., 1986. – 395 с.

5. Рецкер, Я. И. Теория перевода и переводческая практика / Я. И. Рецкер. – М. : Междунар. отношения, 1974. – 216 с.

6. Латышев, Л. К. Межъязыковые трансформации как средство достижения переводческой эквивалентности / Л. К. Латышев. – М. : Высш. шк., 1986. – 107 с.

7. Goethe, J. W. Faust / J. W. Goethe // Theaterstücke / J. W. Goethe. – Frankfurt am Main : Büchergilde Gutenberg, 1956. – 845 s.

8. Гётэ, Ё. В. Фаўст / Ё. В. Гётэ ; пер. з ням. В. Сёмухі. – Мінск : Маст. літ., 1976. – 430 с.

9. Hesse, H. Glasperlenspiel / H. Hesse. – Frankfurt am Main : Suhrkamp Verlag, 1995. – 310 с.

10. Гесэ, Г. Гульня шкляных перлаў / Г. Гесэ ; пер. В. Сёмухі. – Мінск : Маст. літ., 1992. – 342 с.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 16.10.2019

Burau A. A. **Linguistic Aspects of Lexical Transformations in Literary Translation**

The article is devoted to the problem of equivalence of texts in literary translation. The author analyzes and compares such lexical transformations as generalization, concretization, antonymic translation and compensation when translating works of German literature (I. V. Goethe and H. Hesse) into the Belarusian language.